*Еўтухоў, І. А.* Медыявістыка ў БДУ / І. А. Еўтухоў // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 112-116.

***І. А. Еўтухоў***

# МЕДЫЯВІСТЫКА Ў БДУ

Пад тэрмінам медыявістыка (ад лацінскіх слоў medium і aevum), як правіла, маецца на ўвазе галіна гістарычнай навукі, якая вывучае заходнееўрапейскае сярэднявечча. Агульнавызнаным у сусветнай гістарычнай навуцы лічыцца храналагічнае абмежаванне пытанняў медыявістыкі рамкамі V—XV ст. У плане геаграфічным яе інтарэсы вызначаюцца арыялам пашырэння галоўным чынам раманскіх, германскіх і кельцкіх народаў. Асобнае адгалінаванне медыявістыкі складае візанціістыка, навука, якая вывучае ўвесь комплекс пытанняў (палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных, рэлігійных), звязаных з гісторыяй Візантыйскай імперыі. Гісторыя славянскіх народаў Заходняй, Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы перыяду сярэднявечча разглядаецца як неад’емная частка асобнай галіны гістарычнай навукі — славістыкі, асновы якой у Беларускім дзяржаўным універсітэце былі закладзены У. І. Пічэтай. Вывучэнне падзей XVI — першай паловы XVII ст. у заходнееўрапейскай гісторыі, якія савецкай гістарычнай навукай вызначаліся як позняе сярэднявечча, з’яўляецца сферай інтарэсаў гісторыкаў ранняга новага часу.

Асноўным цэнтрам даследавання пытанняў медыявістыкі і падрыхтоўкі адпаведных навуковых кадраў у БДУ з’яўляецца кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Звароты універсітэцкіх навукоўцаў да аналізу сюжэтаў заходнееўрапейскай гісторыі па-за кафедрай былі выключна рэдкімі. Прыклад такога кшталту рэпрэзентуе артыкул прафесара (у тыя часы — дацэнта, загадчыка кафедры гісторыі СССР, дэкана факультэта) А. П. П’янкова, прысвечаны юрыспрудэнцыі сярэднявечнай Францыі (Пьянков А. П. Феодальная юстиция во Францнн в XII—XIV вв. // Ученые записки БГУ. 1939. Сер. ист. Вып. 1. С. 123—134).

Як уяўляецца, дзейнасць універсітэцкай кафедры будзе разгортвацца па наступных кірунках: 1) распрацоўка фундаментальных навуковых праблем, 2) падрыхтоўка навуковых кадраў, 3) забеспячэнне навучальнага працэсу, 4) папулярызацыя дасягненняў галіны. Аднак у розныя перыяды развіцця кафедры ў залежнасці ад аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў актывізуюцца розныя кірункі. На гэтай падставе, гледзячы на перавагу таго ці іншага кірунку дзейнасці, можна прапанаваць наступную перыядызацыю працэсу развіцця медыявістыкі на кафедры гісторыі старажытнага



свету і сярэдніх вякоў БДУ: 1) 1934—1960 гг. — «акадэмічны» перыяд — пераважная арыентацыя на рэалізацыю першага кірунку; 2) 1960—1988 гг. — «асветніцкі» перыяд — пераважная арыентацыя на трэці і чацвёрты кірункі; 3) ад 1988 «ураўнаважаны» перыяд — імкненне да максімальна поўнага напаўнення кожнага з кірункаў.

**«Акадэмічны» перыяд (1934—1960).** У 1934 г. пры заснаванні гістарычнага факультэта БДУ былі створаны кафедра гісторыі старажытнага свету (загадчык —

акадэмік АН БССР, з 1946 г. член-карэспандэнт АН СССР М. М. Нікольскі) і кафедра гісторыі сярэдніх вякоў (загадчык — прафесар, з 1940 г. акадэмік АН БССР У. М. Перцаў). У 1955 г. абедзве кафедры былі аб’яднаны. Загадчыкам зноўстворанай кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў стаў Уладзімір Мікалаевіч Перцаў (1877—1960). Займаў ён гэтую пасаду да канца жыцця.

З улікам таго, што гістарычныя погляды У. М. Перцава былі прааналізаваны мною на мінулай канферэнцыі, цяпер уяўляецца мэтазгодным спыніцца на яго дзейнасці як загадчыка кафедры.

Істотнай хібай «акадэмічнага» перыяду развіцця медыявістыкі на кафедры можа лічыцца яе выключная канцэнтрацыя вакол адзінай асобы. Гэта прывяло да адсутнасці рэалізацыі другога кірунку — падрыхтоўкі навуковых кадраў адпаведнай кваліфікацыі. За ўвесь перыяд не было ніводнай абароны дысертацыі па гісторыі Заходняй Еўропы V—XV ст., хаця неабходныя арганізацыйна-тэхнічныя ўмовы для гэтага існавалі — яшчэ ў сакавіку 1937 г. у БДУ быў створаны савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гістарычных навуках.

**«Асветніцкі» перыяд (1960—1988).** У гэты час на чале кафедры стаялі гісторыкі, у сферу навуковых інтарэсаў якіх не заўсёды патрапляла гісторыя заходнееўрапейскага сярэднявечча, — раманіст доктар гістарычных навук, прафесар Фёдар Макаравіч Нячай (1905—1990, загадчык у 1960—1977 гг.); славіст-паланіст доктар гістарычных навук, прафесар Данііл Сяргеевіч Клімоўскі (1920— 1982, загадчык у 1977—1982); славіст-багеміст — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ніна Антонаўна Гусакова (1929—1992, загадчыца ў 1983—1988). У выніку такога становішча першы кірунак дзейнасці кафедры па пытаннях медыявістыкі (распрацоўка фундаментальных навуковых праблем) быў адсунуты на далёкую перыферыю.

Дастаткова паказальны прыклад у гэтым плане прапануе наступная статыстыка публікацый. У 70-я гг. на кафедры былі падрыхтаваны



тры зборнікі навуковых артыкулаў у складзе 10 (1970 г.), 13 (1974 г.) і 16 (1977 г.) артыкулаў. Пры гэтым пытанні гісторыі Заходняй Еўропы V—XV ст. адлюстраваны толькі ў адной публікацыі атэістычнага характару.

Адзіным выпадкам набліжэння кафедры да разгляду базавых пытанняў медыявістыкі было правядзенне 11—12 сакавіка 1983 г. калёквіума, прысвечанага праблемам міжнародных адносін у сярэднявечнай Еўропе. Удзел у ім прынялі прадстаўнікі Беларускага, Маскоўскага, Ленінградскага, Уральскага, Валгаградскага універсітэтаў, Інстытута ўсеагульнай гісторыі АН СССР, Маскоўскага гісторыка-архіўнага інстытута, Ленінградскага і Магілёўскага педагагічных інстытутаў. Сярод удзельнікаў былі вядучыя савецкія медыявісты таго часу: Н. І. Басоўская, Ю. Л. Бяссмертны, Ю. Я. Івонін, С. П. Карпаў, С. П. Чэрвонаў. Усяго было заслухана і абмеркавана 4 даклады і 14 паведамленняў. Разам з тым, неабходна ўлічваць, што, па-першае, правядзенне калёквіума было звязана з навуковым аўтарытэтам Ю. Я. Івоніна (які пакінуў кафедру ў 1987 г.), па-другое, выступленні супрацоўнікаў кафедры на калёквіуме не закраналі пытанняў заходнееўрапейскай гісторыі V—XV ст.

Сюжэты, звязаныя з медыявістыкай, прысутнічалі ў асобных публікацыях двойчы доктара навук (гістарычных і філасофскіх), прафесара Гілера Мардухавіча Ліўшыца (1909—1983). Акрамя навуковых даследаванняў па гісторыі старажытнага свету з-пад пяра Г. М. Ліўшыца выйшла пэўная колькасць прапагандысцкіх атэістычных публікацый, дзе ён, паводле слоў аўтаркі аднаго з юбілейна-справаздачных артыкулаў, «подвергает научной критике релнгиозную идеологию и

реакционную деятельность церкви»[1]. У выніку дзейнасць Г. М. Ліўшыца прывяла да стварэння новага длн кафедры кірунку атэістычнай прапаганды. Кірунак, звязаны з падрыхтоўкай кваліфікаваных навуковых кадраў, у дзейнасці кафедры, як і раней, не рэалізоўваецца. За ўвесь перыяд (таксама, як і на працягу папярэдняга) не адбылося ніводнай абароны кандыдацкай ці доктарскай дысертацыі па гісторыі Заходняй Еўропы V—XV ст. Разам з тым была праведзена пэўная работа па забеспячэнні вучэбнага працэсу неабходнымі метадычнымі матэрыяламі — дацэнты Н. А. Гусакова і Л. П. Сушкевіч выдалі тэрміналагічны слоўнік (Термины, понятия н определения по курсу истории средних

[1] *Царюк И. О.* Развитие исторической науки // Веснік БДУ. 1981. Сер. 3. № 3. С. 8.



веков. Мн., 1986) і зборнік дакументаў, прысвечаны сялянскім паўстанням (Крестьянские восстания X—XV вв. Мн., 1988).

У другой палове 60-х гг. пачалася распрацоўка 12-томнай Беларускай савецкай энцыклапедыі. Для асвятлення пытанняў гісторыі сярэдніх вякоў (г. зн. краіны Еўропы (у тым ліку і Усходняй), Азіі і Афрыкі за V—XVIII ст., а таксама агульныя тэрміны і біяграфіі асобных гісторыкаў) рэдакцыя ўсеагульнай гісторыі выдавецтва «Беларуская савецкая энцыклапедыя» адвяла 750 артыкулаў агульным аб’ёмам 470 тыс. знакаў (сярэдні аб’ём артыкула 630 знакаў). У рэалізацыі праекта прынялі ўдзел доктар гістарычных навук, прафесар Г. М. Ліўшыц (артыкулы «Візантыя» (раздзел гісторыя), «Візанціназнаўства», «Вялікае перасяленне народаў», «Крыжовыя паходы», «Лацінская імперыя», «Тэўтонскі ордэн») і дацэнт Н. А. Гусакова («Рэканкіста», «Свяшчэнная Рымская імперыя», «Стогадовая вайна», «Франкская дзяржава»). Да кірунку, звязанага з папулярызацыяй дасягненняў медыявістыкі, можа быць аднесены апублікаваны Ю. Я. Івоніным рэферат артыкула даследчыка з Ліёнскага універсітэта П. Гвіспара «Сацыяльны лад Іспаніі пасля арабскага заваявання» (Вопросы историнн. 1974. № 6. С. 186—187). У 1987 г. супрацоўнікамі кафедры быў падрыхтаваны зборнік навукова-папулярных нарысаў «И живы памятью столетий».

**«Ураўнаважаны» перыяд (ад 1988).** У 1988 г. загадчыкам кафедры быў выбраны раманіст па навуковай спецыялізацыі дацэнт Віктар Анатольевіч Фядосік. У наступным — доктар гістарычных павук (1992 г.), прафесар (1993 г.). Менавіта яго дзейнасць вельмі станоўча паўплывала на развіццё медыявістыкі на кафедры. Паступова склалася атмасфера метадычнага плюралізму з невялікай перавагай у бок цывілізацыйнага падыходу, на які арыентуецца прафесар В. А. Фядосік. Месца марксісцкай ангажаванасці ў публікацыях В. А. Фядосіка, прысвечаных сярэднявечнай рымска-каталіцкай царкве, заняло памкненне паказаць праз лёс чалавека гістарычныя працэсы і жыццё (у тым ліку і будзённае) грамадства таго часу — навукова-папулярныя нарысы «В борьбе с папой» (И живы памятью столетий. Мн., 1987. С. 31—47) н «Савонарола: отвергнутый трибун» (Идолы без маски или искушение властью. Мн., 1995. С. 158—172).

Дацэнт А. Дз. Смірнова ініцыіравала разгляд гендэрнай праблематыкі1. Прафесар І. А. Еўтухоў пачаў даследаванне заходнееўрапейскай

[1] *Смирнова Е.Д., Рогач С.А.* Общественно-правовой и семейно-бытовой статус знатной женщины Франции XI –XIV веков. Мн., 1996.

гістарычнай думкі ранняга сярэднявечча з выкарыстаннем структурнага падыходу[1].

Значна актывізавалася работа па падрыхтоўцы навуковых кадраў. На кафедры за 1995—2002 гг. былі паспяхова абаронены пяць кандыдацкіх дысертацый па тэматыцы заходнееўрапейскага сярэднявечча. Пры гэтым вучаніца В. А. Фядосіка Алена Мікалаеўна Сурта стала першай медыявісткай, падрыхтаванай кафедрай.

Для забеспячэння вучэбнага працэсу на кафедры былі падрыхтаваны і выдадзены тры зборнікі дакументаў (Заходнееўрапейскае грамадства ранняга сярэднявечча. Мн., 1997; Средневековый город. Мн., 1998; Франкскае грамадства ў VI ст. Мн., 2001), дапаможнік па гісторыі культуры (Западноевропейская культура. Антнчность н средневековье. Мн., 2001), падручнік для вышэйшых навучальных установ (Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя. У 2 ч. Мн., 2002—2003).

Паспяхова адбываецца на кафедры арганізацыя навуковай работы. Пачынаючы з 1995 г., кожны няцотны год праводзяцца навуковыя канферэнцыі «Лістападаўскія сустрэчы» ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава. У 2000 г. была праведзена аспіранцкая канферэнцыя, прысвечаная 2000-годдзю хрысціянства. На кожнай са згаданых канферэнцый працавала секцыя па гісторыі сярэдніх вякоў.

Новым кірункам у дзейнасці кафедры стаў удзел у падрыхтоўцы падручнікаў для сярэдняй школы. Супрацоўнікі кафедры прынялі ўдзел у стварэнні падручнікаў і хрэстаматыі па гісторыі сярэдніх вякоў для 6 класа (з 2002 г. — 5 класа) пад рэдакцыяй прафесарн В. А. Фядосіка, па ўсеагульнай гісторыі для 10 класа і для ліцэяў. Дацэнт А. Дз. Смірнова падрыхтавала дыдактычныя матэрыялы па гісторыі сярэдніх вякоў для 6 класа. Дзеля папулярызацыі пытанняў медыявістыкі ў 1999 г. дацэнты А. Дз. Смірнова, Л. П. Сушкевіч і прафесар В. А. Фядосік выдалі даведнік «Средневековый мир в терминах, именах и событиях». Нарэшце з гэтай жа мэтай прафесар В. А. Фядосік зрабіў шэраг крокаў, накіраваных на завяршэнне незакончаных выдавецкіх праектаў кафедры. У бліжэйшых планах кафедры — выданне зборніка навукова-папулярных нарысаў «Сжечь — не значит опровергнуть», што быў цалкам падрыхтаваны да друку яшчэ ў канцы 80-х гг. мінулага стагоддзя, У перспектыўных планах — выданне манаграфіі У. М. Перцанм «Древняя Пруссия», што засталася ў рукапісу.

---

[1] *Еўтухоў I.A.* Парадыгма нацыянальнай гісторыі ў ранняе сярэднявечча // Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта: У 7 т. Т. 2. Гісторыя, філалогія, журналістыка. Мн., 2001. С. 147-154.